■ Ёсць праблема

НЕ ПРОСТА НАДПІС ПАД НАГАМІ

З рэкламай на асфальце павінен быць наведзены парадак

Міністэрства гандлю ў найбліжэйшы час звернецца ў мясцовыя выканаўчыя органы ўлады і іншыя зацікаўленыя дзяржорганы для правядзення інвентарызацыі рэкламы на асфальце і ліквідацыі аб'яў, якія не адпавядаюць патрабаванням дзейнага заканадаўства, паведаміла намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ.

Паводле яе слоў, у апошні час у Мінску і іншых гарадах стала з'яўляцца досыць шмат незаконнай рэкламы на асфальце. «Хацела б папярэдзіць бізнес, які гэтую рэкламу размяшчае, — і гандлёвыя прадпрыемствы, і аб'екты грамадскага харчавання, і канцэртныя пляцоўкі пра тое, што гэта можна рабіць толькі са згоды ўласніка. Ахоўваюцца правы любой уласнасці — і прыватнай, і дзяржаўнай», — падкрэсліла намеснік міністра.

Размяшчэнне вонкавай рэкламы дапускаецца пры наяўнасці дазволу адпаведнага мясцовага выканаўчага і распарадчага органа. Таксама неабходна атрыманне дазволу (афармленне пашпарта) і ўзгадненне вонкавай рэкламы, калі яна размяшчаецца ў межах прыдарожнай паласы (кантрольнай зоны) аўтамабільных дарог, чырвоных ліній вуліц, дарог і плошчаў населеных пунктаў.

Асоба, якая размяшчае вонкавую рэкламу (у тым ліку іншыя сродкі вонкавай рэкламы з плошчай рэкламнага поля да 0,5 квадратнага метра) на чужой маёмасці (месцы размяшчэння сродку вонкавай рэкламы) фактычна выкарыстоўвае гэтую маёмасць ва ўласных мэтах. «Паводле грамадзянскага заканадаўства такое выкарыстанне магчыма толькі са згоды ўласніка (або ўпаўнаважанай ім асобы) гэтай маёмасці», — патлумачыла Ірына Наркевіч. Згодна з заканадаўствам, дазвол можа быць ануляваны мясцовым выканаўчым і распарадчым органам пры наяўнасці неадпаведнасці размяшчэння сродку вонкавай рэкламы патрабаванням тэхнічнага нарматыўнага прававога акта.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Дзеля іншых

«ДОБРЫХ СЭРЦАЎ» СТАЛА БОЛЬШ

У Нацыянальнай бібліятэцы адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Добрае сэрца». Удзел у мерапрыемстве ўзялі больш як 300 чалавек, у першую чаргу камандзіры і ўдзельнікі валанцёрскіх атрадаў.

Конкурс праходзіў у некалькі этапаў: на раённым, абласным і рэспубліканскім узроўнях. Самых лепшых выбіралі ў пяці намінацыях, у прыватнасці «Найлепшы валанцёрскі атрад», «Асабісты ўнёсак», «Валанцёрскія справы — у фотааб'ектыве».

Акрамя непасрэдна ўзнагароджання, актывістаў руху на працягу дня чакалі цікавыя і карысныя мерапрыемствы. Для іх праводзілі трэнінгі па канфлікталогіі, пераадоленні стрэсавых сітуацый, аратарскім майстэрстве. У валанцёраў была магчымасць задаць пытанні калегам з іншых краін — у якасці гасцей на цырымоніі прысутнічалі эксперты трэнерскага пула Савета Еўропы і прадстаўнікі рэсурснага цэнтра SALTO Еўрапейскай валанцёрскай службы па краінах Усходняй Еўропы і Каўказа.

— Мая галоўная выснова наконт сённяшняга мерапрыемства — у Беларусі вельмі добра арганізавана валанцёрства на мясцовым узроўні, — падзяліўся ўражаннямі **эксперт Савета Еўропы, кіраўнік эстонскай арганізацыі міжнародных валанцёрскіх праектаў EstYES Аляксандр КУРУШАЎ.** — Вельмі шмат маладых людзей, якія шчыра цікавяцца і займаюцца гэтай справай; думаю, не ў кожнай заходнееўрапейскай краіне ёсць такое. Маёй жа задачай сёння было расказаць пра міжнародныя валанцёрскія праекты, у якіх удзельнічаюць нашы актывісты, і патлумачыць, як да гэтай справы могуць далучыцца валанцёры з Беларусі.

Між іншым, мінулы год стаў для валанцёрскага руху знакавым. Упершыню з'явіліся так званыя «Асабістыя кніжкі валанцёра», у якіх фіксуецца ўся інфармацыя па добраахвотнай дзейнасці хлопцаў і дзяўчат. Гэты дакумент будзе ўлічвацца пры паступленні ў ВНУ на спецыяльнасці сацыяльнага кірунку. Па словах **каардынатаркі руху «Добрае сэрца» Вікторыі МЯНАНАВАЙ**, Год моладзі прыдаў новы імпульс валанцёрскаму руху ў краіне. У 2015-м актывісты працавалі на Сусветнай выставе EXPO-2015 у Мілане, на чэмпіянаце Еўропы па мастацкай гімнастыцы, маладзёжным чэмпіянаце Еўропы па баскетболе 3х3. Яшчэ адно знакавае мерапрыемства, якое правялі добраахвотнікі, — чарговы дабрачынны марафон «Усе фарбы жыцця для цябе», падчас якога аказвалі дапамогу асобным людзям і арганізацыям.

— Наш атрад працуе ў самых розных кірунках, — распавядае **другакурсніца факультэта псіхалогіі і педагогікі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, валанцёр атрада «Эдэльвейс» Наталля МІРОНАВА.** — Асноўны — гэта догляд ветэранаў. Акрамя таго, працуем з дзецьмі-сіротамі і дзецьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Для апошніх, напрыклад, ладзім тэатральныя пастаноўкі, прыдумляем спецыяльныя гульні... Усяго ў атрадзе больш за 60 чалавек з самых розных устаноў: школьнікі, студэнты, працоўная моладзь. Валанцёрства мне падабаецца тым, што адчуваеш сябе патрэбным камусьці і набіраешся важнага жыццёвага досведу.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 14 января 2016 г. торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества	Здание логистического центра «Каледино» общ. пл. 4024,4 м², расп. по адресу: г. Молодечно, ул. Машерова, д. 41, износ 66,72%, фундамент ж/бет. башмаки, бетонный, ленточный; стены ж/б колонны, каркас, крупнопанельные, крыша рулонная совмещ., к-во этажей 1 (один) (инвентарный номер в ЕГРНИ 630/С-37809; наименование: здание логистического центра «Каледино»; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)
Местонахождение имущества	Минская обл., г. Молодечно, ул. Машерова, д. 41
Начальная цена	12 799 492 000 рублей
Сумма задатка	1 279 949 000 рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10
Балансодержатель (должник)	Общество с ограниченной ответственностью «БелФом»

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Аукцион проводится **14 января 2016 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 10.12.2015 по 11.01.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

«АРАНЖАВЫ — КОЛЕР РАДАСНЫ»

«Дыямент «Нацыянальнай бібліятэкі на адзін вечар засвяціўся аранжавым колерам — у знак барацьбы з гвалтам у дачыненні жанчын і дзяўчат.

Фота Надзеі БУКАН.

— Аранжавы — радасны колер, ён сімвалізуе свет мужчын і жанчын, у якім няма гвалту, — кажа **Алена КАСЬКО, намеснік прадстаўніка фонду Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у галіне народнасельніцтва.** — Праблема знявагі жанчын з'яўляецца не нацыянальнай, а глабальнай. Звыш 600 мільёнаў жанчын жыве ў краінах, дзе хатні гвалт сёння не лічыцца злачынствам. Паводле леташняга сацыялагічнага даследавання, ад падобнага віду гвалту пакутуюць 3 з 4 беларусак. І для нас важна, каб падобная праблема не заставалася асабістай, а стала публічнай.

Разам з Мінскам аранжавую кампанію, якая з'яўляецца ініцыятывай генеральнага сакратара ААН, падтрымалі ў Стакгольме, Стамбуле, Джакарце, Капенгагене, Бялградзе, дзе аранжавым колерам таксама падсвяцілі славутыя помнікі архітэктуры. Усяго да акцыі далучыліся ў 70 гарадах свету.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

З САМЫМ ЛЕПШЫМ — У ТУРКМЕНІСТАН

Нацыянальная выстаўка беларускіх тавараў пройдзе з 11 па 13 снежня ў Туркменістане. Наша краіна збіраецца прадставіць у Ашхабадзе свой эканамічны, экспартны, інвестыцыйны, турыстычны і культурны патэнцыял.

Сярод удзельнікаў 115 арганізацый, у тым ліку «Белнафтахім», Белдзяржхарчпрам, Беллегпрам, Беллеспаперапрам, Белкаапсаюз, а таксама прадпрыемствы БелАЗ, «Гомсельмаш», МАЗ, «Амкадор». У рамках нацыянальнай экспазіцыі плануецца прэзентаваць навукова-тэхнічныя распрацоўкі ўстаноў адукацыі і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дасягненні ў сферы ваеннай прамысловасці, нафтахіміі, лёгкай прамысловасці, а таксама шырокага кола экспартна арыентаваных вытворчых прадпрыемстваў. Беларусь раней дэманстравала сваю прадукцыю на Нацыянальнай выстаўцы-кірмашы ў Ашхабадзе летась. Па яе выніках арганізатары адзначылі высокую папулярнасць беларускіх тавараў у Туркменістане.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

ПІЛЬНАСЦЬ ПЕНСІЯНЕРКІ ВЫРАТАВАЛА ЯЕ ЗБЕРАЖЭННІ

Жыхарка Навагрудскага раёна адчула, што яе абакралі, і своечасова выклікала міліцыю. Гэта дазволіла праваахоўнікам аператыўна затрымаць зладзеек.

Як паведамляе прэс-служба Упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама, чатыры жанчыны хадзілі па вёсцы Лозкі, нібыта збіраліся купіць у мясцовых жыхароў свойскую жывёлу і птушак. Як аказалася, на мэце ў іх было зусім іншае... Калі яны трапілі ў дом 67-гадовай пенсіянеркі, тры жанчыны паспрабавалі адцягнуць увагу гаспадыні размовамі, а чацвёртая тым часам прысвоіла 4 тысячы долараў.

Пасля сыходу нечаканых гасцей пенсіянерка адчула дрэннае, грошай не знайшла і адразу патэлефанавала ў міліцыю. Праз 40 хвілін па прыкметах зламысніц затрымалі. У выніку грошы жыхарцы Лозкаў вярнулі, а ў дачыненні зладзеек завялі крымінальную справу.

НЯМА ФЛІКЕРА — ЗАПЛАЦІ ШТРАФ

За апошнія выхадныя супрацоўнікі ДАІ па краіне прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці 2649 пешаходаў. 1099 з іх рухаліся без святлоадбівальных элементаў.

— Пешаход можа выходзіць на край праезнай часткі толькі ў выключных выпадках. Калі няма тратуара, пешахонай ці веладарожкі, а ўзбочына непрыдатная, дазваляецца ісці па краі дарогі і толькі насустрач транспарту, які рухаецца, — кажа **Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэння УДАІ МУС.** — У такім выпадку пры абмежаванні бачнасці і ў цемры пешаход абавязаны абазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі. Важна, каб яны не былі закрытыя складкамі адзення, сумкай ці парасонам. Пры гэтым выкарыстанне флікераў не дае права парушаць правілы дарожнага руху і беспадстаўна выходзіць на праезную частку!

За парушэнне ПДР пешаходамі прадугледжана адказнасць у выглядзе папярэджання альбо штрафу ад 1 да 3 базавых велічынь. А калі пешаход у момант правапарушэння яшчэ і п'яны, штраф павялічваецца да 5 базавых.

Якаў ЖУРБІН.

ШЧУЧЫНСКІ РАКЕТАМАДЭЛІСТ — АДЗІН З НАЙЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ

Васьмікласнік СШ №2 г. Шчучына Максім Пянькоўскі ўдастоены прэміі Гродзенскага аблвыканкама імя Аляксандра Дубко, якая ўжо традыцыйна ўручаецца лепшым школьнікам і студэнтам.

Сёлета прэстыжную прэмію ў розных намінацыях атрымалі 39 таленавітых маладых людзей Гродзеншчыны. Шчучынскі школьнік — за дасягненні ў ракетамадэльным спорце, якім ён з дзевяцігадовага ўзросту займаецца ў раённым цэнтры тэхнічнай творчасці. Пачынаў з папяровых ракет, а цяпер ужо вырабляе ўнікальныя мадэлі. Прычым Максім кажа, што інтарэс да канструявання толькі ўзрастае. Ён удзельнічаў у двух этапах Кубка свету па ракетамадэльным спорце, што адбыліся ў Гродне і літоўскім горадзе Марыямпалі, па выніках якіх займае пятае месца ў свеце сярод юніёраў і дзясятае — сярод дарослых. Цяпер Максім і педагог цэнтра Яўген Чашчэвік, які вельмі ганарыцца дасягненнямі свайго выхаванца, працуюць над новай мадэллю, каб, як яны спадзяюцца, перамагчы на чарговых спаборніцтвах.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by